Пераклад

Федэральнае міністэрства замежных спраў

СУПРАЦОЎНІЦТВА З ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦЮ

# Пашырэнне супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю краін Усходняга партнёрства і Расіі

Праграма па пашырэнні супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю краін Усходняга партнёрства і Расіі з 2014 года дапамагае грамадзянскім супольнасцям адыгрываць сваю ролю дэмакратычных суб’ектаў, а таксама актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні трансфармацыйных працэсаў у краінах-партнёрах.

З мэтай умацавання свабоды, бяспекі і дабрабыту ў рэгіёнах, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад нас, а праз гэта – таксама і ў ЕС і Германіі, у рамках праграмы Усходняга партнёрства Федэральны ўрад падтрымлівае меры, **накіраваныя на стварэнне і пашырэнне ўстойлівых структур супрацоўніцтва грамадзянскіх супольнасцяў паміж дэмакратычнымі, недзяржаўнымі суб’ектамі з Германіі, з аднаго боку, і краін Усходняга партнёрства (Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіны), а таксама Расіі - з другога.**

**Праграма накіравана на развіццё доўгатэрміновага супрацоўніцтва, раўнапраўнага партнёрства і справядлівага размеркавання абавязкаў паміж партнёрамі ў Германіі і краінамі рэалізацыі праграмы.** Праграма ахоплівае ўвесь спектр праектнай дзейнасці ў галіне культуры і адукацыйнай палітыкі.

Ва ўмовах агрэсіўнай вайны Расіі супраць Украіны, якая парушае нормы міжнароднага права і працягваецца ўжо пяты год, а таксама далейшага звужэння прасторы дзеянняў для суб’ектаў і структур грамадзянскай супольнасці на большай частцы рэгіёна, падтрымка гэтых суб’ектаў і структур застаецца тым больш актуальнай.

## 1. Умацаванне плюралізму і ўстойлівасці – для падтрымкі разнастайнасці меркаванняў і СМІ і барацьбы з замежным інфармацыйым маніпуляваннем і ўмяшаннем.

Плюралізм з’яўляецца неад’емным элементам сучасных дэмакратый, легітымнасць якіх засноўваецца перш за ўсё на талерантнасці да разнастайнасці меркаванняў, інтарэсаў і каштоўнасных уяўленняў у грамадстве.

У рамках праграмы Усходняга партнёрства падтрымліваюцца праекты, якія спрыяюць ўмацаванню разнастайнасці інфармацыі, меркаванняў і СМІ, змагаюцца супраць замежнага інфармацыйага маніпулявання і ўмяшання і павышаюць здольнасць адпаведных краін супрацьстаяць ім. Праекты павінны спрыяць устойлівасці грамадстваў супраць ненадзейнай і фальшывай інфармацыі шляхам узмацнення ролі і павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў СМІ, а таксама паляпшэнню доступу да

якаснай і плюралістычнай (лакальнай) інфармацыі ў СМІ. У гэтай сувязі могуць падтрымлівацца ініцыятывы па распрацоўцы і выкарыстанні лічбавых тэхналогій для абароны.

**2. Спрыянне дыскусіям аб каштоўнасцях і правах чалавека – для паглыблення ўзаемаразумення.**

У рамках гэтага накірунку падтрымка можа быць аказана перш за ўсе праектам па абмене і культурным праектам. Мерапрыемствы па арганізацыі сустрэч павінны рабіць магчымым абмен думкамі аб фундаментальных каштоўнасцях, такіх як павага да правоў чалавека, правамернасць кіраўніцтва, незалежнасць судоў, права асобы на жыццё і свабоду развіцця, а таксама мажарытарны прынцып прыняцця рашэнняў. Сумеснае адстойванне гэтых каштоўнасцяў спрыяе ўзаемаразуменню ўнутры рэгіёну краін Усходняга партнёрства і фарміраванню большай дасведчанасці ў Германіі пра гэтыя краіны. Падтрымка можа быць аказана мерапрыемствам, якія спрыяюць перадачы і ўмацаванню названых асноўных каштоўнасцяў праз абмен паміж прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці або культурна-палітычныя праекты, а таксама садзейнічаюць развіццю сувязяў паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў краінах-партнёрах і ў кантэксце еўрапейскай інтэграцыі і супрацоўніцтва.

**3. Стварэнне перспектыў будучыні і падтрымка дэмакратычнай трансфармацыі – для ўзмацнення дэмакратый, барацьбы з карупцыяй і падтрымкі збліжэння з ЕС.**

У рамках гэтай мэты падтрымка можа быць аказана ініцыятывам, якія ўзмацняюць дэмакратычныя памкненні для стварэння надзейных грамадскіх перспектыў будучыні для ўсіх. У прыватнасці, ва Украіне нашым прыярытэтам з’яўляецца падтрымка працэсаў рэформ і трансфармацыі, у тым ліку ў кантэксце еўрапейскай інтэграцыі, а таксама захаванне і аднаўленне структур грамадзянскай супольнасці, якія былі пашкоджаны або разбураны ў выніку расійскай агрэсіўнай вайны. Акрамя гэтага, мы падтрымліваем праекты, якія спрыяюць уступленню ў ЕС Украіны, Рэспублікі Малдова, еўрапейскай перспектыве Грузіі і набліжэнню Арменіі да ЕС. У Расіі і Беларусі мы канцэнтруем нашу падтрымку на сегментах грамадзянскай супольнасці, якія, нягледзячы на ўзмацненне рэпрэсій, і якія, нават у выпадку дзейнасці ў эміграцыі, могуць працягваць уплываць на сітуацыю ў саміх краінах і, напрыклад, выступаюць за забеспячэнне выканання асноўных правоў. Падтрымка таксама можа быць аказана мерапрыемствам у сферы акадэмічнай, прафесійнай і грамадска-палітычнай адукацыі і павышэння кваліфікацыі, якія матывуюць да павелічэння грамадскай актыўнасці і робяць магчымым удзел у палітычнай і грамадскай дзейнасці асабліва для маргіналізаваных груп. Гэта таксама прадугледжвае меры па падтрымцы актывістаў грамадзянскай супольнасці і партнёраў па праектах, якія ў выніку вайны, пераследу, рэпрэсій або асабліва складаных грамадскіх абставінаў сутыкаюцца з павышанымі цяжкасцямі.

**4. Падтрымка дыялогу і збліжэння – меры ўсталявання даверу для пераадольвання рэгіянальных канфліктаў у перспектыве.**

Падтрымка можа быць аказана мерапрыемствам у сферы культуры і адукацыі, якія садзейнічаюць прадухіленню або пераадольванню крызісаў у нявырашаных рэгіянальных канфліктах і, такім чынам, ствараюць глебу для ўзаемаразумення. Гэтая мэта важная для атрымання падтрымкі ў прыватнасці ў краінах Паўднёвага Каўказа (Арменія, Азербайджан, Грузія), а таксама ў Рэспубліцы Малдова. Вітаюцца праектныя

прапановы, якія робяць акцэнт на рэгіянальным аспекце трансгранічнага **супрацоўніцтва краін Чарнаморскага рэгіёна** і тым самым спрыяюць стварэнню сінергіі з Чарнаморскай стратэгіяй ЕС.

У ходзе агрэсіўнай вайны Расіі або дзяржаўных рэпрэсій людзі з Украіны, Расіі і Беларусі былі вымушаны пакінуць сваю радзіму і пераехаць у іншыя краіны Усходняга партнёрства, таму што яны падвяргаліся пагрозам і рэпрэсіям з-за сваіх перакананняў. Таксама могуць падтрымлівацца праекты, якія спрыяюць дыялогу і актыўнаму ўдзелу гэтых людзей у грамадскім жыцці, умацоўваюць іх сувязі з грамадзянскай супольнасцю новай краіны пражывання і тым самым робяць унёсак у фарміраванне ўстойлівых, інклюзіўных і дэмакратычных грамадстваў.

**У <u>2027 годзе</u>** таксама вызначаны наступныя прыярытэтныя напрамкі для асобных краін:

- **Арменія / Азербайджан:** праектныя прапановы, накіраваныя на падтрымку трансгранічнага працэсу прымярэння на ўзроўні грамадзянскай супольнасці.
- **Арменія:** праектныя прапановы па далейшай падтрымцы набліжэння Арменіі да ЕС
- **Беларусь:** Падтрымка незалежных СМІ ў эміграцыі, а таксама захаванне самабытнасці беларускай мовы і культуры.
- **Грузія:** Праектныя прапановы, накіраваныя на падтрымку плюралістычнай і ўстойлівай грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ, а таксама на барацьбу з дэзінфармацыяй.
- **Украïна:** Праектныя прапановы, якія спрыяюць дасягненню мэтаў нямецка-украінскага культурнага сезона 2027/2028.

**Фармальныя перадумовы (больш падрабязная інфармацыя ў раздзеле FAQ (папулярныя пытанні))**

Праекты супрацоўніцтва ў сферы грамадзянскай супольнасці могуць атрымаць падтрымку, калі яны ажыццяўляюцца ў **Германіі, Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Рэспубліцы Малдова і Украіне ці ў Расіі** і аб'ядноўваюць не менш за дзве праектныя арганізацыі (адна з іх у Германіі і не менш за адну з краін праграмы). Магчымы і вітаецца дадатковы ўдзел партнёрскіх арганізацый з **Францыі** і / або **Польшчы** ў рамках супрацоўніцтва ў фармаце «Веймарскі трохвугольнік». Падтрымка таксама можа быць аказана праектам з партнёрскімі арганізацыямі, якія знаходзяцца ў часовай эміграцыі ў гэтых краінах ці ў Германіі.

Падтрымліваюцца **выключна <u>праекты ў сферы грамадзянскай</u> супольнасці і структуры**, г.зн. суб’екты, якія не маюць дачынення да дзяржаўнай улады ці бізнесу.

Сродкі, якія выдзяляюцца, з’яўляюцца сродкамі праектнага фінансавання, якія падпарадкоўваюцца прынцыпу гадавога бюджэтавання. Такім чынам, праекты павінны быць завершаны на працягу 2027 года, г. зн. не пазней за 31.12.2027. Федэральнае міністэрства замежных спраў вітае таксама шматгадовыя праекты працягласцю да трох гадоў толькі пры наяўнасці падрабязнага і пераканаўчага абгрунтавання.

Мінімальная сума падтрымкі складае 50.000 €. Выдаткі на меры бяспекі, неабходныя для рэалізацыі праекта, могуць фінансавацца ў рамках праекта. Праетныя прапановы

(на нямецкай або англійскай мове) прымаюцца з 7 жніўня да 15 верасня 2026 года **выключна** на сайце:

**http://oepr.diplo.de**

На гэтым сайце размешчана дадатковая інфармацыя і інструкцыі па падачы праектных прапаноў. Унясенне змен у праектныя прапановы, якія ўжо былі пададзены, або падача прапаноў пазней вызначанага тэрміну немагчыма.

Атрымальнікі падтрымкі абавязаны прадаставіць дакументы для пацвярджэння мэтазгоднага выкарыстання атрыманых срокаў і справаздачы па праектах у адпаведнай форме. На аснове гэтых дакументаў Федэральнае ведамства па замежных справах і Федэральнае міністэрства замежных спраў праводзяць праверку мэтазгоднасці выкарыстання атрыманых сродкаў і паспяховасці рэалізацыі праектаў, а таксама праверку праграмы аказання падтрымкі ў цэлым. Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці ў Агульных і асаблівых дадатковых умовах, даступных для загрузкі, ці ў рамках паведамлення аб рашэнні, прынятым па заяўцы.

**Пры ўзнікненні пытанняў просім Вас спачатку азнаёміцца з раздзелам FAQ (папулярныя пытанні).** Калі на Ваша пытанне не знайшлося адказу, Вы можаце звярнуцца да адпаведнага аддзела Федэральнага ведамства па замежных справах якое, пры неабходнасці, перанакіруе вас да адказных супрацоўнікаў Федэральнага міністэрства замежных спраў. Калі ласка, дасылайце пытанні па электроннай пошце на адрас: oepr@bfaa.bund.de

У выпадку ўзнікнення **тэхнічных праблем** пры карыстанні сайтам http://oepr.diplo.de просім звяртацца да спадарыні Юліі Мельтке (E-Mail: f-pf-1-1-8@bfaa.bund.de) і спадарыні Джанет Стэфаняк (E-Mail: f-pf-1-1-5@bfaa.bund.de)